Вы гатовыя да стварэння трывалых міжнародных сувязяў паміж гарадамі? // Вы стаміліся ад старых ідэй і спосабаў абмену?// Вы любіце дзяліцца сваімі ідэямі і вопытам?
**Калі верыце, што гарады-пабрацімы ўсё яшчэ могуць змяніць свет да лепшага ва ўмовах глабалізацыі – давайце аб'ядноўвацца!**

## Запрашэнне да ўдзелу

# Twin City BarCamp

Тбілісі (Грузія) // 18 – 21 Лістапада 2021

**З 18 па 21 лістапада 2021 года ў Тбілісі пройдзе Twin City BarCamp.**
***Станьце часткай руху. Падавайце заяўку неадкладна.***

У нашым TwinCity-BarCamp мы б хацелі:
... аб'яднаць творчых людзей і актыўных аднадумцаў
... абмяняцца як найлепшымі практыкамі, так і няўдалым досведам
... заахвоціць вас думаць больш маштабна
... разам згенерыраваць новыя ідэі
... далучыць людзей і супольнасці да пабрацімства гарадоў
... сумеснымі намаганнямі распрацаваць новыя фарматы ўзаемадзеяння, абмену і міжкультурнага дыялогу

TwinCity-BarCamp факусуецца на Вашых ведах, досведзе, ідэях і інтарэсах. Гэта значыць:
- Загадзя запланаванай праграмы не існуе;
- Кожнаму ўдзельніку прапануецца прадставіць свае тэмы для стварэння ўласнай праграмы;
- Ня знаёмыя з BarCamp? Перайдзіце на сайт www.twincitylab.net/barcamp-faq

## Удзел:

Падаць заяўку на ўдзел у TwinCity-BarCamp можна, калі вы:
- удзельнічаеце ў праектах і мерапрыемствах, якія аб'ядноўваюць гарады-пабрацімы (гарады-партнёры), альбо маеце натхняльныя ідэі;
- ведаеце, як складана наладзіць трывалыя сувязі паміж людзьмі і гарадамі;
- жывяце ў Беларусі, Германіі, Грузіі, Расіі, Украіне;
- цікавіцеся распрацоўкай новых спосабаў устанаўлення сувязяў паміж людзьмі і гарадамі-пабрацімамі;
- валодаеце англійскай або рускай мовай у якасці першай ці другой мовы;
- гатовыя ўнесці свой уклад у правядзенне жывых сустрэч у фармаце інтэрактыўных мерапрыемстваў.

## Пакрыццё расходаў

Якія выдаткі пакрывае TwinCity Lab?
- Міжнародныя/нацыянальныя авіябілеты ў Тбілісі і з Тбілісі;
- Грамадскі транспарт для мэтаў BarCamp
- Пражыванне і харчаванне падчас працы BarCamp
- Уваходныя квіткі на экскурсіі

## Заяўка

Калі ласка, запоўніце форму: www.twincitylab.net/application

**Заявы разглядаюцца ў парадку паступлення. Рэгіструйцеся зараз!**

Калі ласка, накіруйце запрашэнне на ўдзел асобам, якія адпавядаюць профілю. Калі ў Вас узнікнуць пытанні, звяртайцеся да кіраўніка праекту: ivan@twincitylab.net

## Расклад

| | |
|---|---|
| Прыбыццё і рэгістрацыя | 18 лістапада 2021 |
| Знаёмства | 18 лістапада 2021 |
| TwinCity-BarCamp Дзень #1 | 19 лістапада 2021 |
| Нетворкінг | 19 лістапада 2021 |
| TwinCity-BarCamp Дзень #2 | 20 лістапада 2021 |
| Ад'езд | 21 ноября 2021 |

## Звярніце ўвагу!

Уменне мець зносіны на ангельскай мове з'яўляецца абавязковай умовай. Працоўнай мовай будзе ангельская.

## Пра нас

The Twin City Lab – гэта праект Brains & Bridges (Берлін) і NKI - Новая культурная ініцыятыва (Мінск), накіраваны на развіццё партнёрскіх адносін паміж гарадамі-пабрацімамі, пашырэнне магчымасцяў гарадскіх супольнасцяў і павышэнне ўзроўню міжнародных абменаў і сувязяў.
Brains & Bridges - гэта міжнародная няўрадавая арганізацыя, якая базуецца ў Германіі і якая займаецца пытаннямі супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасцю.

BRAINS & BRIDGES knowledge connects e.V.

policult Innovative Events für Politik, Kultur & Bildung

BarCamp-Infopartner:

7x7

YOUTH SPACE

Funded by:

Auswärtiges Amt